УДК 631.559:631.584/633.85:631.442.1

І. А. ЮШКЕВІЧ, М. В. РАК

ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПАРЖЫШЧАВЫХ КРЫЖАКВЕТНЫХ КУЛЬТУР НА ПЯСЧАНЫХ ГЛЕБАХ

Ва ўмовах Беларусі на глебах лёгкага грануламетрычнага саставу магчымыя пасевы паржышчавых кармавых культур у севазвароце [1, 2]. Мэтазгоднасць вырошчвання паржышчавых культур у севазваротах на лёгкіх глебах у іншых рэгіёнах адзначаюць шмат якія даследчыкі [3—6]. Пасевы прамежкавых культур пры выкарыстанні на корм і зялёнае ўгнаенне дазваляюць павысіць прадукцыйнасць ворыва на 17—30%, знізіць засмечанасць пасеваў, палепшыць фітасанітарныя ўмовы ў севазвароце [7]. Яны садзейнічаюць таксама павышэнню колькасці арганічнага рэчыва ў глебе і зніжаюць страты пажыўных рэчываў з кораненаселенага пласта ад вымывання [8]. У Германіі для павелічэння выхаду гною і ўзбагачэння пясчаных глебаў арганічным рэчывам на 50% плошчы ворыва вырошчваюць прамежкавыя культуры, зялёная маса якіх выкарыстоўваецца на корм жывёле [9]. У даследаваннях, праведзеных на лёгкіх глебах, раней у якасці паржышчавых культур вырошчваліся ў асноўным бабовыя [1, 2, 10].

У задачу нашых даследаванняў уваходзіла вывучэнне магчымасці павышэння прадукцыйнасці ворыва пры дапамозе насычэння севазвароту паржышчавымі крыжакветнымі культурамі. Даследаванні праводзіліся ў эксперыментальнай базе «Падалессе» Рэчыцкага раёна на працягу 1983—1985 гг. на дзярнова-падзолістых пясчаных глебах, якія

Табліца 1. **Уплыў угнаенняў на ўраджайнасць паржышчавых крыжакветных культур на пясчаных глебах**

Унесена ўгнаенняў на 1 га, кг			Азімая свірэпіца				Рэдзька алейная			
азімае жыта+ +азімая свірэпіца		авёс+ +рэдзька алейная (мінеральных)	ураджай зялёнай масы		прыбаўленне, ц/га		ураджай зялёнай масы		прыбаўленне, ц/га	
арганічных	мінеральных		ц/га	ц/га к. адз.	ад угнаенняў	у тым ліку ад паслядзеяння арганічных	ц/га	ц/га к. адз.	ад угнаенняў	у тым ліку ад паслядзеяння ўгнаенняў
—	—	—	21,6	2,4	—	—	12,3	1,2	—	—
—	290*/240	260/200	82,0	9,0	60,4	—	63,1	6,3	50,8	—
—	450/240	340/200	81,5	9,0	59,9	—	66,4	6,6	54,1	—
20/0	290/240	260/200	108,3	11,9	86,7	25,3	74,9	7,5	62,6	11,8
20/0	450/240	340/200	107,9	11,9	86,3	26,4	75,8	7,6	63,5	9,4
30/0	290/240	260/200	115,1	12,7	93,5	33,1	75,4	7,5	63,1	12,3
40/0	290/240	260/200	116,9	12,9	95,3	34,9	77,6	7,8	65,3	14,5
$НІР_{05}$, ц/га			18,6				11,4			

* У лічніку — угнаенні пад асноўную культуру севазвароту, у назоўніку — пад паржышчавую.